Б Ю Л Е Т Э Н Ь

Р А Д Ы
БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ РЭСПУБЛІКІ

Нр.I. 19 - С т у д з е н ь - 26 НР.I.

П О К Л І Ч

З беспрыкладнай у гісторыі народаў адвагай Беларускі Народ вядзе змаганьне за сваё вызваленьне ад чужацкай няволі.

Каб зьменшыць вагу барацьбы за вольнае слова, за родную школу, за мову і засваё палітычнае і гаспадарска- эканамічнае жыцьцё, - нашы ворагі штодня карыстаюцца сваей і заграранічнай прэсай, каб давясьці сьвету, што гэта бандытызм, а не вялікая вызвольчая барацьба за сваю свабоду. Паўстаньня ў Заходняй і ва Усходняй Беларусі жорстка душацца, а падаюцца весткі ў прэсу, што беларускае сялянства і непісьменна, і нацыянальна несьвядома, а таму зьвяртаць увагу на іх барацьбу і дамаганьня, не варта.

Не дармо на ўсім абшары этнаграфічнай Беларусі нашы ворагі карыстаюцца ў гэтым сэнсе тымі самымі доказамі:

> Цяпер ясна відаць кажэ Савецкая Беларусь на Усходзе, :"што ў варунках сучаснага капіталістычнага ладу збудаваць мужыцкую Беларускую Рэспубліку" - сіламі аднаго сялянства на 60% няпісьменнага, і на 90% нацыянальна несьвядомага, - ёсьць заданьне ілюзорнае, вельмі далёкае ад зьдзейсьненьня"(Сав.Бел. 3I. XII.25. Нр.296/I596/).

Тое самае гавораць і паны - на Захадзе. Вывад па іхняму адзін: селянін няпісьменны і нацыянальна несьвядомы мусіць падпарадкавацца альбо, як "кулак" - камуністам і іх партыі, альбо, як "несьвядомае быдла" - панам, якія ўжо і давядуць селяніна да маткі праўды.

Аднак бэз дапамогі тых і другіх, Беларускі Народ сваей сялянскай массай вызнаў сябэ суверэнным гаспадаром Беларусі і актам 25- сакавіка 1918 г. замацаваў сваю дзяржаву. Не адважываецца і Савецкая Беларусь супярэчыць праўна-юрыдычнаму акту гэнага дню, але прызнаецца шчыра, што пакуль цэніць не права, а сілу і таму прымушана сьвяткаваць незалежнасьць I-га студзеня 1919 г.- камуністычную.

Розум і павага, з якой Беларускі Народ ставіўся да сваей дзяржавы, як у прошласьці - Беларуска-Літоўскае Княства, так і цяпер - Беларускай Народнай Рэспублікі, як творчай волі ўсяго Беларускага Народу, дэмакратычнага па істоце і цьвердага ў сваім "Я", гаворыць за правільнасьць яго шляху.

Гэтага не адкідаюць і безстаронныя дасьледчыкі беларускага руху

з варожага стану:

"Усюды сярод беларускай люднасьці можна бэз труднасьці сьцьвердз: моцны стан самаўсьведамленьня, асабліва сацыяльна-клясовага, рэл: гійнага, а таксама і нацыянальнага і, хоць праўда, болей у значэ: ні нэгатыўным - неналежнасьці да даных нацыянальнасьцяў, ніж у п: зытыўным - належнасьці да аднэй з іх". (К.Сроковскі. Справа народовос: цёва на крэсах всходніх. Краков 1924 г. бал.7)

Мы верым, што традыцыйна ўзгадаваны на праве і справядлівасьці Белар: скі Народ ніколі не падпарадкуецца сіле дыктатуры, і як актыўна, так пасыўна, што дасьледчыкі называюць нэгатыўным самаўсьведамленьнем у : рунках трохсот-летняга занепаду пад гвалтам польскай і расейскай ула: - будзе змагацца за свае права на поўнае зьдзейсьненьне народапраўст:

Мы не карыстаемся дэмагогіяй і не заклікаем да таго, чаго н: мож: даць. Наш шлях - шлях праўды. На абман народу і за кліч яго да ўсясь: тнага шчасьця ў той час, як ён галодны і халодны, абрабованы чужынц: абліваецца крывёй і потам у змаганьні за свае права - мы не пойдзем.

Трэба ўпарадкаваць свае жыцьцё, трэба Беларускі народ зрабіць га: даром на сваей зямлі ў першую чаргу, а потым ужо памагаць і другім : родам у мэтах агульначалавечага шчасьця.

Прэзыдіум Рады Беларускай Народнай Рэспублікі стаіць на варце гэ: інтарэсаў заграніцай, тая, як даручыла яму Рада Рэспублікі 13-га сьн: ня 1919 г. - Голас Усебеларускага Зьезду.

Духоўная, як і рэальная сувязь паміж Прэзідіумам Рады і Беларускі: Народам, не гледзячы на варожые акупацыі, не парвана. Гэта мы бачым ш: дня з той барацьбы, якую вядзе Беларускі Народ на тэрыторыі Савецкаі Беларусі - на Усходзе і пад Польшчай - на Захадзе.

Здраднікі і перэкідчыкі, то ў адзін бок, то ў другі - самі па с: атрымалі засуд Беларускага Народу.

Далейшая праца, як наша заграніцай, так і ўсяго Беларускага Нар: на Бацькаўшчыне павінна скінуць панаваньне чужынцоў і даць мейсца Б: рускаму Народу на ўсей этнаграфічнай Беларусі, дзе ён становіць адме: ную большасьць.

Сьмела наперад за нацыянальную і сацыяльную роўнасьць.
Ніхай жыве Беларускі Народ.
Не пазволім панам і камуністам фальшаваць волю Беларускага Наро:
Супраць сілы - мы ставім ідэю, супраць гвалту - пратэст.

Старшыня Рады
Беларускай Народнай Рэспублікі П.Крэчэўскі.

оо О оо

ЗАГРАНІЧНАЯ ПРЭСА.

Загранічная Эўрапэйская прэса, як і краевая Беларуская, апавесьці сьвет аб здачы мандатаў Ураду БНР. Савецкай Беларусі і, быццам бы, пе: езьдзе ў Менск не толькі некаторых Членаў бышага Ураду, але і Прэзы: му Рады Рэспублікі.

Пры адсутнасьці свайго органу заграніцай, Прэзыдіум Рады не мог : часова рэагаваць у Краёвай прэсе, бо яна знаходзіцца ў варожых незал:

ніцкай групе, руках.

Карыстаемся Бюлетэням, каб давясьці да ведама беларускага грамадзянства тыя спраставаньня, якія былі паданы Прэзыдыуман Рады ў заграні-чнай прэсе і не былі надрукаваны ў беларускай:

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ РАДЫ БНР.

"Урад Беларускай Народнай Рэспублікі 4-кастрычніка падаў "Старшыне Рады Крэчэўскаму просьбу аб дэмісыі. Дэмісыя прынята. Пасьля дэмісыі на Канфэрэнцыі ў Бэрліне I2-I5 кастрычніка паміж быўшымі членамі Ураду стварыўся раскол.

Адна частка прыняла пляцформу Радавай Беларусі і згадзілась ехаць на нацыянальную працу ў Менск, другая цьверда стала на абарону суверэнных правоў Рады Рэспублікі ў адношаньні ўсей этнографічнай Беларусі.

За гэтыя мандаты і вялася ўся барацьба на Канфэрэнцыі.

Усім вядома, што Польшча на Заходнюю Беларусь, ні Масква на Усходнюю, суверэнных правоў ня маюць. Сувэрэнітэт належыць, на падставе Усебеларускага Кангрэсу I9I7 г. выключна Радзе Беларускай Народнай Рэспублікі, у асобе Прэзыдыуму Рады знаходзячэмуся сёньня заграніцай.

З захаваньнем мандатаў, адпала небэзпэка санкцыянаваньня Рыжскай умовы і фактычнага падзелу Беларусі, якіх Народ Беларускі не вызнае і лічыць гвалтам з боку акупантаў, як Заходу, так і Усходу Беларусі.

М.Вершынін.

(Трыбуна.7.XI.25.Нр 259.)

Д Э М Э Н Т І.

Супраць вестнам, распаўсюджаным з Коўна, што, на падставе амністыі Беларускай Савецкай Рэспублікі, вернецца да Менску Прэзыдыум Рады БНР., на чале з Крэчэўскім, Прэзыдыум абвяшчае, што гэтыя весткі зьяўляюцца злоснай выдумкай. Названы Прэзыдыум заступае целую этнаграфічную Беларусь і на зварот пад чужую акупацыю і не думае.

Крэчэўскі - Прызыдэнт Рады Беларускай
Народнай Рэспублікі.

(Чэскословенска Рэпубліка 4.XII.25.Нр.33I. і Трыбуна 4.XII.25.Нр 282)

С П Р А С Т А В А Н Ь Н Е

Ва ўсей заграгічнай прэсе зьявілась паведамленьне, распаўсюджанае польскім тэлеграфным агентствам ПАТ, аб махм пераездзе ў Менск, як старшыні Рады Беларускай Народнай Рэспублікі, разам з Віцэ-Старшынёй В.Захарко. Там-жа гаворыцца і аб перадачы мандатаў Савецкай Беларусі - Беларускім Урадам.

Весткі гэтыя ні на чым не аснованы і інспіруюцца з Масквы (Руль - Нр I488.) Прычынай гэтаму паслужыла Бэрлінская нарада зьменатычнікаў I2-I5 кастрычніка. На нарадзе пытаньне аб мандатах падымалась,

але пасьля таго, як стала вядома, што Урад яшчэ 4-кастрычніка г.г падаў мне адстаўку, зусім адпала.

Авантурызм такой пастаноўкі пытаньня - перэдачы мандатаў Савецкай Беларусі - сам па сабе сьведчыць аб поўнай глупоце ініцыятар гэтага замыслу. У роўнай стопні ён разьлічан і на несьвядомасьць тых камуністычных дыпляматаў, якія вялі торг за гэтыя мандаты.

Мандаты павінны быць зьвернуты таму, ад каго яны атрыманы. Ня жо-ж у цяжкі момант Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, яго Саюзу прыдзе ў галаву думка перэдаваць сувэрэнныя правы рускага народу Кітайскаму Імпэратару, ці Турэцкаму Султану.

Правал быў вочавісты і камбінацыя не ўдалася. Аднак , гэта не застанавіла новых спрытных падслугачоў Савецкай Улады - Цвікевіча Зайца і Пракулевіча, зрабіць падлог і, не будучы ўжо Міністрамі, даць ад імя Ураду пакутную заяву вызнаньня Савецкай Улады.

Прэзыдіум Рады такое паступаньне назваў здрадай незалежнасьці Беларусі і ніякай адказнасьці за гэтае не нясе, адкінуўшы ў корні юрыдычнае значэньне такое заявы.

Вярхоўная Улада на тэрыторыі этнаграфічнай Беларусі, згодна па тановы Рады Рэспублікі 13-сьнежня 1919 г., належыць выключна Прэзыдіуму Рады, зараз знаходзячамуся заграніцай і таму авантура Цвікевіча можа разглядацца толькі як здрада народу, волі якога ён не выпаўніў і перайшоў у стан яго ворагаў, каб умацаваць уціск акупантаў многапакутнай Бацькаўшчынай.

Цяпер да Прэзыдіуму Рады перайшла і выканаўчая ўлада. Прэзыдіум у сваей далейшай працы вызначыць, ці патрэбна, адсутнасьці тэрыторыі выканаўчая ўлада заграніцай, у асобе Ураду, ці абойдзецца пакуль яе, да высьвятленьня моманту ў яе неабходнасьці.

Сацыялізм і дэмакратызм ніколі не можа пагадзіцца з дыктатурай Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, а таму і наш пераезд у Менск мог бы зьдзейсьніцца толькі пасьля паду рэжыму дыктатуры.

Старшыня Рады
Беларускай Народнай Рэспублікі Крэчэўскі.

(Ковенская газэта "ЭХО" 15.XII.25.)

о-о-О-о-о

М А Н Д А Т Ы БНР.

Даклад чытаны ў Беларускім Студэнскім Клюбе ў Празе 16-студзен 1926 г.

Усебеларускі Кангрэс 1917 г., у ліку каля 2000 - дэлегатаў Ім нем Беларускага Сувэрэннага Народу, абвесьціў рэспубліканскі лад на тэрыторыі этнографічнае Беларусі. Працы сваей Зьезд да канца н давёў і бы, разогнаны рукамі насільнікаў - Маскоўскіх бальшавікоў Кангрэс быў разогнаны аружнай сілай, а беларуская тэрыторыя акуп

вана Маскоўцамі. Даўясьці справу да канца Кангрэс даручыў выбранай Кангрэсам Радзе Зьезду і Выканаўчаму Камітэту, якія ня гледзячы на бальшавіцкі тэрор на другі жэ дзень пасля разгрому 18.XII.17 г., сабраўшысь у Дэпо Лібаво-Роменскай чыгункі, вынясьлі рэзалюцыю, у каторай абвесьцілі сябе насіцелямі суверэннай улады Беларускага Народу. Рада зьезду сабралась патаемна і ўхваліла такія пастановы:

1) лічыць, што першы Усебеларускі Зьезд, разогнаны сілаю;- 2) Раду Зьезду прызнаць выканаўчым органам Зьезду; 3) папоўніць Раду Зьезду дэлегатамі зямляцтва; 4)-5) лічыць распушчанымі ўсе беларускія арганізацыі, існаваўшыя дагэтуль, апроч Цэнтральнай Вайсковай Рады, якая існую як орган падуладны Радзе; 6) склікаць другі Усебеларускі Зьезд у найкаротшы тэрмін і 7) для павялічэньня аўтарытэту Рады, Прэзыдіумам Рады зрабіць Прэзыдіум Зьезду, павялічыўшы яго адным намесьнікам Старшыні і двумя Сэкрэтарамі.

(Зборнік "Беларусь" бал.199-200).

Рада Зьезду папоўненая прэдстаўнікамі з мейсц, у 1918 г. перэтварылась у Беларусі Парлямэнт - Раду Беларускай Народнай Рэспублікі, а Выканаўчы Камітэт у Раду Народных Міністраў.

У такім выглядзе, на падставе права самаакрэсьляньня народаў, пастаноў Усебеларускага Кангрэсу і абвешчэньня Рады Рэспублікі 25 сакавіка 1918 г.- была вызнана Беларуская Дзержава - Беларуская Народная Рэспубліка.

З гэтымі актамі лічыліcь ня толькі нашы прыяцелі, але і нашы ворагі. Гэта мы бачым з тых заяў, якія былі зроблены на перэгаворах у Рызе Старшынямі Расейскай і Польскай Дэлегацый.

Старшыня Савецкай Дэлегацыі Іоффэ у сваей дэкляроцыі 24-верэсьня 1920 г. на 7- сходзе расейска-польскай Канфэрэнцыі заявіў:

"Выходзячы з поўнага прызнаньня прынцыпу самаадзначэньня,РСФСР ужо ў 1917 г. прызнала і незменна прызнае бэзумоўна і бэз усякіх агранічэньняў, незалежнасьць і суверэннасьць Польскай Рэспублікі; у 1918 г.- Незалежнасьць Украіны і Беларусі, а ў 1920 г. падпісала мірную ўмову з Незалежнай і Суверэннай Літоўскай Рэспублікай.

Тое самае заявіў і Старшыня Польскай Дэлегацыі - Домскі 4-кастрычніка 1920 г.

"Польская Рэспубліка, не чэкаючы пачыну з боку Расеі вызнала незалежнасьць Літвы, Украіны і Беларусі".

(Акт Рэгэнцыйнай Рады 1918 г.)

На падставе гэтых заяў Рыжская умова 18.III.21 г. сьвердзіла гэта прызнаньне. §1. умовы гаворыць:

Абедзьве дагаварываючыяся стараны, згодна прынцыпу самадзначэньня народаў, прызнаюць незалежнасьць Украіны і Беларусі".

Акупанты беларускай тэрыторыі, як на Захадзе (Палякі), так і на Усходзе (Расейцы), прызнаўшы сувэрэннасьць Беларускай Народнай Рэспублікі, а тым самым і яе законадаўчыя і выканаўчыя органы, бэз згоды і ў атсутнасьці на Канфэрэнцыі Рады Рэспублікі і Ураду, падзялілі паміж сабой Буларусь Рыжскай умовай і сталі шукаць спосабаў набыцьця нейкіх, хоць і заведама фальшывых сувэрэнных правоў на тыя тэрыторыі, якіх яны пазбавілі адна другую. Гэты момант у тым-жа § Рыжскай умовы зафіксаваны так:

Расея і Украіна адмаўляюцца ад усякіх правоў і дамаганьняў на землі, распаложаныя на Захад ад гэтай граніцы.

Са свайго боку Польшча адмаўляецца на карысьць ~~на карысьць~~ Украіны і Беларусі ад усіх правоў і дамаганьняў на землі, распаложаныя на Усход ад гэтай граніцы".

Важна адзначыць тут, што афіцыяльных прэстаўнікоў ад Савецкай Беларусі на Канфэрэнцыі не было, а таму і Іоффэ не адважыўся побач з Расеяй і Украінай сказаць, што і Беларусь адмаўляецца ад зямель, ляжачых на Захад ад Рыжскай граніцы.

Само сабой разумеецца, што ні Расея, ні Польшча ня мелі права як прэтэндаваць на беларускую тэрыторыю, так і адмаўляцца ад той, ці іншай часткі неналежачэй ім зямлі, згодна папярэдняму вызнаньню незалежнасьці і сувэрэннасьці Беларусі.

РСФСР. на Усходзе знашла выхад і абвесьціла паўторна, як толькі абачыла, што вайна 1920 г. праграна, Савецкую Сацыялістычную Беларускую Рэспубліку. Улада, утвораная Маскоўскімі акупантамі, сама сабой прэтэндаваць на сувэрэннасьць не магла. Тут запанавала дыктатура шляга маскоўскага пралетарыяту над Беларускім сялянствам з некаторай дамешкай і нацыянальна-беларускага элемэнту камуністычных напрамкаў. Гэта не была воля народу, а прымус акупантаў.

Зусім інчэй глядзела на справу Польшча. Страціўшы надзею на граніцы 1772 г., Польшча не хацела адмовіцца ад нейкага сувэрэнітэту на падставе гістарычных правоў Люблінскай вуніі 1569 г. на значную частку Заходняй Беларусі, з Менскам уключна. Дзеля гэтага Пільсудскі і Падарэвскі, прыкінуўшысь прыяцелямі Беларусі, угаварылі Старшыню Рады Міністраў Луцкевіча ў Парыжу, выехаць у Варшаву і Менск, каб там распачаць нібыто дзержаўную дзейнасьць і склікаць чарговую сэсію Рады. Гэта абецанка была дана пад варункам, што Луцкевіч угаворыць Раду і беларускае грамадзянства стаць на лаяльны шлях да Польшчы.

Фальш і недарэчнасьць гэтай справы была вочывіста для ўсіх загранічных прадстаўнікоў Беларускай Дзержаўнасьці, але суперэчыць гэтаму і адмовіцца ад паездкі ў Менск на чарговую, быццам сэсію Рады, было немагчыма, бо варункі складаліс так, што бэз іхняга удзелу пастанова аб лаяльнасьці да Польшчы была-б вынесена абавязкова, так як на гэтым грунце ўжо даўно працаваў Нацыянальны Камітэт у

Менску і да яго далучыўся ня толькі Старшыня Рады Народных Міністраў Луцкевіч, але і Старшыня Рады Беларускай Народнай Рэспублікі Лёсік, са сваім Намесьнікам Уласавым.

Пільсудскаму і яго спадручнаму у Менску - Ваевудскаму хацелася атрымаць ад Рады Рэспублікі мандат на сувэрэнітэт у Заходняй Беларусі.

Калі высьветлілась, пасля прыезду загранічных дэлегатаў у Менску, то большасьць Рады настроена варожа да Польшчы і ні на якія кампрамісы з Польшчай пайсьці не можа, тады Ваевудскі, паманійшы мілёнамі перад паланафільскай часткай Рады, запатрабаваў расколу Рады. Але настрой у Радзе і паміж беларускім грамадзянствам быў настолькі варожы да Польшчы і пераэкідчыкаў - Радных, што пакорные Пілсудскаму сябры Рады, не адважыліся прысьці на сход Рады 13-сьнежня 1919 г.

Сход Рады за прысутнасьцю кворума, адбыўся бэз паленафілаў і замест прывітаньня Пілсудскаму, як яны прапанавалі, выняс рашучы пратэст супроць акупантаў.

Рада Б.Н.Р. не здрадзіла сувэрэнітэту свайго народа і захавала мандаты і правы на ўладу.

Новаабранаму Прэзыдыуму Рады былі перэданы вярхоўныя правы Беларускага Народу, да тае пары, пакуль яны ня будуць мець магчымасьці зьвярнуцца на Бацькаўшчыну.

Аднак ня гледзячы на такі абарот справы, на другі, ці трэці дзень пасьля праўнага і паўнамочнага сходу Рады, адбыўся і прыватны сход адкалоўшыхся паланафілаў, якія жабаяліся выявіць свой твар перэд Беларускім народам і яны, зыйшоўшысь на кватэры Уласава, стварылі фальшывы прэстаўнічы орган Беларускага Народу, патрэбны для палякоў, пад назвай "Найвышэйшай Рады".

Але пачуцьцё "Найвышэйшых" было надзвычайна дрэннае, бо нават і Палякі абачылі, што ніякай юрыдычнай цэннасьці такая ўстанова мець не можэ і на яе падставе прэтэндаваць на голас беларускага народу, а тым барджэй на сувэрэннасьць Беларусі, не прыходзіцца.

Пры такіх варунках, нават Старшыня Польскай Дэлегацыі Домскі ў Рызе не мог карыстацца заявай Найвышэйшай Рады, падпісанай Іваноўскім, што беларускі народ згаджаецца на культурна-нацыянальную аўтаномію ў Польшчы. Здрада Найвышэйшай Рады стала яснай ня толькі для Палякаў, але і самых "Найвышэйшых". Свае мандаты, як нікому непатрэбные сведкі абмылак і здрады прывёз у Рыгу і здаў Радзе Рэспублікі, адзін з членаў Найвышэйшае Рады ў 1921 г. - Тэрэшчэнка.

Не ўдаўшаяся спроба захопленьня мандатаў праз Раду Рэспублікі прымусіла Польшчу шукаць абходнага спосабу иры дапамозя Віленскага Сэйму, скліканага на 8-студзеня 1922 г.

Усьвядомленая сваей нацыянальнасьці і сваіх правоў, як нам вядома, беларускае жыхарства байкатавала выбары ў Сойм. Сойм праваліўся, скампрамітаваўшы Польшчу ў вачах Эўропы і яшчэ больш падкрэсьліў значэньне мандатаў Б.Н.Р. Але Польшча не траціла надзеі і надалей.

У зьвязку з тым, як часам умацсўвалася становішча акупантаў бе‑
рускіх тэрыторый і асабліва, пасля прызнаньня "Статут кво" пастан‑
вай Амбасадараў І4-сакавіка І923 г. за Польшчай і прызнаньнем нека‑
торымі з вялікіх дзержаў Антанты РСФСР. – стала павялічацца смага
на беларускія мандаты.

Старыя спосабы былі немагчымы, жыхарства як пад Польшчай, так і
ў Саюзе Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік адносілась варожа да аку‑
пантаў. Трэба было знайсьці новы спосаб – спосаб раскладу самога
Ураду і Прэзыдыуму Рады. Польшча натраўлівала на кампрамітацыю бел‑
рускіх дзержаўных установ – беларускіх паланафілаў, РСФСР – камуні‑
таў у Менску і камуніствуючых у Вільні, а Літва ўжо ўнясла заразу
раскладу ў самы Урад.

Гэнай бруднай справай занялася і частка С-Р. партыі заграніцай.
(Извешеніе 8.XII.23г.)

Літва скарысталася цяжкім матэрыяльным становішчам Рады Рэспуб‑
лікі і Ураду і запрапанавала Старшыне Рады Міністраў – Ластоўскаму
службу на акрэсьленай пэнсыі і нейкую, для вока, беларускую культу‑
рную працу, замест шырокага супрацоўніцтва з Беларускім Урадам на
падставе ўмовы ІІ-кастрычніка І920 г.

Сымпатыі Ластоўскага да Літвы былі ўсім даўно ведамы, але да
Гэнуэзскай Канфэрэнцыі яны ня шкодзілі беларускай справе і ня супе‑
рэчылі ўмове з Літвой.

Пасля падачы ў Гэнуі ў І922 г. заявы на імя Старшыні Рады Мін‑
страў Літоўскай Рэспублікі Гальваноўскага аб перадачы Вільні Літве
на што беларусы ніколі не згаджаліся і не маглі згодзіцца бэз наро‑
нага вырэшэньня, Ластоўскі, а таксама і Цвікевіч, падпісаўшы гэную
заяву, змушаны былі падацца , адстаўку. Адстаўка, у адсутнасьці Ст‑
аршыні Рады Рэспублікі прыняў Намесьнік Старшыні В.Захарко. Пры зва‑
роце з Прагі Старшыні Рады Рэспублікі пры новых умовах і адказе, я‑
Ластоўскага так і Цвікевіча ад паданай заявы, часова была ўтворана
Дзержаўная Калегія, пад кіраўніцтвам Старшыні Рады, у якую былі за‑
прошаны, за адсутнасьцю людзей за граніцай, зноў Ластоўскі і Цвіке‑
віч. Аднак ужо ўжо пасьля ўсяго таго, што было – прошлай салідарна‑
сьці не заставалася і адносіны паміж сябрамі ўраду с кожным днём
псаваліся і надалей працаваць у такіх умовах ужо было немагчыма.

20-красавіка І923 г. Ластоўскі змушан быў выйсьці ў адстаўку і
са складу Калегіі, падаўшы такую заяву:

"Яго Дастойнасьці пану Маршалку Прэзыдіуму Рады Беларускай
Народнай Рэспублікі. Высокапаважаны Пётр Антонавіч. Пры існуючых у‑
імаадносінах далейшую працу лічу для сябе немагчымай, а дзеля гэта‑
прашу Вас ад сягоняшней даты лічыць мяне выбыўшым са складу Дзержа‑
най Калегіі. Прыміце запэўненьне ў належнай да Вас пашане і прыхільн‑
насьці. В.Ластоўскі".

Пратаколам ад таго 20-красавіка І923 г. адстаўка Ластоўскага
была прынята.

Ластоўскі адышоў, адмовіўшысь зусім ад палітычнай справы, абяцаючы ня толькі не перашкаджаць справе, а нават памагаць (той-жа пратакол 20.IУ.23 г.).

Аднак з ад'ездам Рады Рэспублікі і Ураду ў Прагу, Ластоўскі мусіў рабіць не тое, што яму хацелася, а тое, што прыказываў Літоўскі Урад. Хутка прышлося абачыць Ластоўскага ў Жэнэве як беларускага прэдстаўніка ў ролі абаронцы Літоўскіх інтэрэсаў.

У гэтай супэрэчнасьці з яго заявай, адыгрывалі не малую ролю і асабістыя ўзаімаадносіны паміж Ластоўскім і Цвікевічам, які таксама адмовіўся ехаць у Прагу, ссылаючыць на сваё фамілійнае становішча, а фактычна сачыўшым нейкія свае асабістыя мэты.

Перад ад'ездам у Прагу паўстала пытаньне і аб утварэньні новага Ураду. Цвікевіч зусім не адпавядаў становішку Старшыні, бо і да яго ўжо не было веры пасля Генуэзскай заявы, але нажаль і не было другой, адпаведнай гэтаму становішчу асобы. Прышлося даручыць утварэньне габінэту ўсё-ж такі Цвікеічу, асабліва пасля яго раптоўнай і скромнай заявы, што яму будзе надзвычайна непрыемна, калі старшынства будзе аддана другому, бо ён на правох былога намусьніка Старшыні, у сваю апошнюю паездку ў Прагу рэкамэндаваўся Чэхаславацкаму Міністру Заграничных спраў, як Старшыня Рады Міністраў Б.Н.Р.

Прышлося зрабіць уступку, але ўсё-ж такі ня верачы яму цалкам, абмежыць яго дзейнасьць, аб чым можэ сьведчыць ніжэй паданая пастанова:

ПРАТАКОЛ

Аб'еднанага Сходу Членаў Прэзыдіуму Рады і Ураду Б.Н.Р. ад 23-жніўня 1923 г. м.Коўна.

Былі прысутны: П.Крэчэўскі, А.Цвікевіч, В.Захарка, Л.Заяц, Я. Варонко і У.Пракулевіч.

СЛУХАЛІ:

I. Заяву Старшыні Ураду Б.Н.Р. А.Цвікевіча аб стварыўшымся Урадзе ў складзе: Старшыня Рады Міністраў і Міністра Заграничных Спраў А.Цвікевіча, Міністра Асьветы Я.Варонкі, вып.аб. Міністра Фінансаў В.Захаркі, Дзержаўнага Кантралёра Л.Зайца і Дзержаўнага Пісара У.Пракулевіча.

ПАСТАНАВІЛІ:

2. Новы склад Ураду прыняць да ведама. Падцьвердзіць, што ўся праца Ураду вядзецца згодна пастановы Рады Рэспублікі ад 13-сьнежня 1919 г. Прэзыдіумам Рады і Радай Народных Міністраў супольна пад кіраўніцтвам Старшыні Рады Рэспублікі П.Крэчэўскага.

УВАГА: Прэзыдіум Рады і Рада Народных Міністраў асобна не засядаюць.

Старшыня Рады Рэспублікі П.Крэчэўскі, Старшыня Рады Міністраў А.Цвікевіч, сябры Рады Міністраў: В.Захарка, Л.Заяц, Яз. Варонка, Дзержаўны Пісар У.Пракулевіч.

2-га Лістапада I923 г. Рада і Урад аканчальна пераехалі ў Прагу, там як эмігранты знайшлі поўную падтрымку з боку Чэхаслававацкага Ураду на роўне з усімі эмігрантамі народу бышае Расеі. Цвікевіч, хоць і застаўся ў Коўне, але карыстаўся аднолькава з усімі падтрымкай і ў гэты самы момант углядаўся то на Літвіноў, то на Савецкую Беларусь.

Літва жадаючы падтрымаць Ластоўскага, агітавала сама на Віленшчыне супраць Беларускага Ураду і ўжывала для гэтых мэтаў Ластоўскага. Увесь час х-дэкі беларускія ў Вільні былі ў зносінах з х-дэкамі Ластоўскімі, у руках якіх, была ўлада.

Началі гаварыць, што трэба дагаварыцца безпасярэдня з Віленшчынай абмінаючы Урад і вясьці справы з народам. Ластоўскі ў сваіх мэтах гэта падтрымліваў. Віленшчына пачала гутаркі аб спыненьні працы Ураду і перэтварэньні яго для культурнай працы ў Нацыянальны Камітэт. Прыслана была нават нейкая дзікая пастанова Краёвага Цэнтру ад II-лютага I924 г. дзе прапанавалася спыніць працу Ураду, на што яны не мелі ніякага права і залажыць Камітэт, які бы зьвязаўся з Лігай Нацый, а ўсім арыентавацца на Усход, пакінуўшы для культурнай працы ў Літве Ластоўскага.

Думка аб спыненьні Ураду падхапілася камуністамі, якія пачалі напіраць у гэтым сэнсе на спрыяючых ім паслоў Беларускага Пасольскага Клюбу ў Варшаве праз Варшаўскае Полпрэдства.

Такім чынам да раскладаючэй працы Ураду БНР Польшчы і Літвы далучылася Масква і стала сачыць за гэтай справай. Два гады рабіліся падкопы пад Беларускую Дзержаўнасьць і справа ніяк не ўдавалась, бо на варце даручаных яму інтарэсаў беларускага народу цьверда стаяў Прэзыдіум Рады.

Нарэшце ў I925 г. камуністы захапілі ў свае рукі беларускія галоўкі ў Вільні і пачалі націскаць, як мы даведаліся толькі пасля Бэрлінскай Канфэрэнцыі, на Цвікевіча, патрабуючы здачы мандатаў БНР.

Аб гэтым гаварыла і адбыўшаяся 2-верасьня I925 г. нарада, аб якой Цвікевіч Прэзыдіум Рады да Бэрлінскай Канфэрэнцыі не дакладаў. А паміж іншым там Цвікевіч не маючы ніякага права гаварыць за Раду Рэспублікі, Прэзыдіум якой толькі і мог вясьці размову аб мандатах абяцаў здаць мандаты, склікаўшы канфэрэнцыю ў Бэрліне.

Прэдстаўнікі Віленшчыны і Савецкай Беларусі, хоць і абяцалі зьявіцца на Канфэрэнцыю, але не зьявілісь, ня хочучы браць адказнасьць за авантуру Цвікевіча.

Да самага моманту скліканьня канфэрэнцыі IO-кастрычніка, ніхто ня ведаў, што будзя за канфэрэнцыя і хто сапраўды на ёй будзе. Невядома было нават на які кошт канфэрэнцыя склікаецца.

Акрэсляна з нахілам на Менск, Цвікевіч выступаць баяўся, ведаючы, што спачуцьця ў гэтым напрамку, яго акцыя мець не можэ, а таму працаваў пацiху. Зьвязаны пратаколам 23- жніўня I923 г. Цвікевіч адкрыта выступаць і ня мог, бо яго Старшынства было фікцыяй. Трэба было законспіравацца і апіраючысь, быццам-бы, на Край напіраць усе

сілы на ліквідацыю Ураду.

Прыкрывалась гэта і перэгаворамі з Літвой. Літва была зацікаўлена ў ліквідацыі Ураду, каб дагаварыцца з прыватнымі асобамі ў стасунку да Вільні і Віленшчыны, вырваўшы ад іх прызнаньне Вільні за Літвой.

Патайныя перэгаворы з камуністамі Менска і Масквы падавалі надзеі Цвікевічу, што камуністы за перэдачу мандатаў даруюць яму ўсё прошлае і узнагародзяць добрай пасадай у Менску. Але нажаль камуністы ня знал̇і, ці не хацелі знаць, што гэтыя мандаты Цвікевічу не належаць. Цвікевіч рабіў выгляд, што ён гэта зрабіць можэ, калі толькі раней аб гэтым ніхто не даведаецца. Дзеля гэтага ў свой прыезд у Прагу, Цвікевіч запэўніў усіх, што справа аб мандатах на канфэрэнцыі ставіцца не будзе, а на нарадзе 2- верэсьня сам па сабе згодзіўся перэдаць мандаты Менску.

Каб таемніца не раскрылась, невядомым нам чынам пасля перэгавораў з Пурыцкісам, быўшым Міністрам Заграначных Спраў у Літве, Цвікевіч вырваў ад Літвіноў 3000 літаў на канфэрэнцыю і рабіў уражэньне, што гэта канфэрэнцыя склікаецца для абгавораў Літоўска-Беларускіх узаемаадносін, а не з той мэтай, якую сачыў Цвікевіч і ўжо атрымаў грошы ад бальшавікоў.

Таемніца гэта была раскрыта толькі ў Бэрліне, калі на абгавор была пастаўлена зьменнатычніцкая рэзалюцыя і за яе галасавалі тыя, хто, як відаць, раней быў у змове з Цвікевічам, але яшчэ поўнасьцю не аддаваў сабе адчоту ў тым, што гэта ёсьць авантура прадажы мандатаў.

Ніхто не сумлеваўся ў тым, што Менск становіцца цэнтрам культурна-нацыянальнай працы ва Усходняй Беларусі, як і прызнаваў у гэтым яго дасягненьня. Але нам таксама было вядома, што ўся палітычная і эканамічная праца ў Савецкай Беларусі вядзецца чужынцамі, элемэнтам прышлым, нічога супольнага з Беларусьсю ня маючым. Да гэтае пары Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка не мае свацй беларускай камуністычнай партыі, а мае сэкцыю Усесаюзнай камуністычнай партыі на Беларусі.

Але партыя РКП., цяпер Усесаюзная, хацела мець мандаты БНР. як сувэрэннай установы не тольеі на Усходнюю, но і на Заходнюю Беларусь. Торг з гэтага і пачаўся.

Як крумкачы сядзелі за вуглом прыёмшчыкі мандатаў Ульянаў і Желуновіч у Бэрліне, прысланыя з Менску, каб заплаціць сваіх 30- срэбрэнікаў Цвікевічу за жывую душу Беларускага народу.

Паводжэньне Членаў Ураду Зайца і Прак.левіча было невыразнае, не гледзячы на тое, што пры ад'ездзе з Прагі ім дана была інструкцыя, абгавораная ўсімі разам, а з іхняга боку падана заява аб адстаўцы. Вось гэта заява:

"Старшыні Рады Беларускай Народнай Рэспублікі П.Крэчэўскаму.

Прымаючы пад увагу, што пытаньне ліквідацыі Ураду Буларускай Народнай Рэспублікі можэ быць пастаўлена на павестку дня канфэрэнцыі ў Бэрліне, просім прыняць, гр. Старшыня, нашу адставку, каб мець свабодныя рукі ў абароне Беларускай Дзержаўнасьці на падставе Усебеларускага Кангрэсу I9I7 г.

Дзержаўны Кантралёр Л. Заяц

Выкон. абав. Міністра Фінансаў В. Захарко

Дзержаўны Сэкрэтар У. Пракелевіч".

Прага, 4-кастрычніка I925 г.

На заяве рэзалюцыя: Адстаўка прынята I0-кастрычніка I925 г.
Старшыня П. Крэчэўскі.

Апрача таго ў інструкцыі гаварылась:

I. Правы канфэрэнцыі выплываюць з паўнамоцтваў канфэрыруючых старон. Рэзалюцыі і пастановы набываюць сілы толькі пасля зацьверджэньня іх праўнымі органамі трох частак Беларусі на раўнапраўных асновах;

2. Дэлегаты Ураду БНР едуць на Канфэрэнцыю з інфармацыйнымі мэтамі. Абмен поглядамі з адпаведнымі кіраўнікамі трох частак этнаграфічнай Беларусі і перэконаньне ў добрай волі супрацоўніцтва на карысьць адраджэньня Беларусі, могуць даць дэлегатам права прыняць у Канфэрэнцыі удзел на стала.

3. Пры разбежнасьці поглядаў, толькі падаўшы адстаўку на рукі Старшыні Рады БНР. Сябры Ураду могуць прыняць удзел у Канфэрэнцыі пэрсанальна, бэз адказу за іх паводжэньне Ураду.

Не гледзячы на паданую адстаўку, невыпаўненьне інструкцыі і супроць пастановы 23-жніўня I923 г., Члены Ураду Пракулевіч і Заяц, пад гіпнозам Цвікевіча, пайшлі на здрадны крок авантурнага рэвалюцыянізму - сэпаратнага сходу Ураду, нават бэз чацьвертага члена Ураду прысутнага на канфэрэнцыі, В. Захарко і падпісалі пратакол прызнаньня Савецкай Беларусі.

Пратэст Захарко прымусіў авантурнікаў перэглядзець пратакол і напісаць другую рэдакцыю толькі аб ліквідацыі Ураду, пад якой бы мог падпісацца і Захарка, каб спыніць авантуру Цвікевіча тут і не даць магчымасьці выступіць яму, як Старшыні Рады Народных Міністраў у Менску.

Разумеецца і такая форма не меняла зьместу авантуры і не магла мець юрыдычнага значэньня, як безпраўная з усіх бакоў пастанова.

Аднак і пасля гэтага Цвікевіч, Заяц і Пракулевіч, падпісаўшы як Міністры, прылажылі сваю першую пастанову, як дадатак да пратаколу і пердалі прыёмшчыкам.

Трудна думаць, каб прэдстаўнікі СССР. і Менску не бачылі ўсей авантуры Цвікевіча. Усё роўна пры адстаўцы, ці нават бэз адстаўкі,

пратакол аб ліквідацыі Ураду, а тым барджэй, перэдачы мандатаў бэз зацьверджаньня Старшыні Рады, ніякай вагі мець не мог і зьяўляўся падлогам і спэкуляцыей з аднаго боку, і юрыдычным абсурдам, разлічаным на несьвядомасьць, калі не сказаць на глупоту, як сябе, так і тых, каму гэтыя пастановы і мандаты гатаваліся.

Што гэта так можэ сьведчыць і ліст бышага Старшыні Ураду БНР. Цвікевіча, надрукованы ў Савецкай Беларусі (I5.II.25, Нр.259/I558/) дзе авантурызм Цвікевіча знайшоў апошні свой вырааз і сказаў тое, чаго не было нават у пратаколах, але на чым асабіста Цвікевіч хацеў здабыць ласку камуністаў:

"Пасля гэтага німа нічога дзіўнага, калі Урад рашыў здаць свае мандаты і тым падкрэсьліць значэньне Менску".

Вышла падвойная авантура. Замест ліквідацыі Ураду, як установы, Цвікевіч ліквідаваў толькі сябе і сваіх таварышоў - Зайца і Пракулевіча і цяпер ад імені Ураду гаворыць у Савецкай Беларусі, што Урад рашыў здаць мандаты.

У высьцігах выслугоўваньня перэд камуністамі гэта група зайшла так далёка, што рэзалюцыяй на канфэрэнцыі ў Бэрліне абвесьціла ўсіх хто выступае супроць Савецкае Беларусі, здраднікамі справы вызваленчага беларускага руху.(Савецкая Беларусь I8.IX.25, Нр.262).

Атака на Урад БНР. пад уплывам камуністаў, вялася на Віленшчыне даўно, але дасягнула свайго аппогею, як раз у часе канфэрэнцыі.

У гэты момант былі надрукованы (Жыццё Беларуса I0.X.25 г. Нр.I0 і Беларуская крыніца II.X.25 г.Нр.3.) агідныя артыкулы, дакараючыя Беларускі Урад куском эмігрантскага чорнага хлеба, запамятаваўшы тое што адзін пасол у Варшаўскім Сойме меў у месяц больш пэнсыі, як усе чатыры сябры Ураду разам. Ня будзем гаварыць аб тым, ці кожны з іх раб)ў у чатыры разы болей працы на карысьць Беларусі, ніх Урад, но факт астаецца фактам.

Аб гэтым можна былоб і не пісаць, але той факт, што на Канфэрэнцыю не зьявіліс прэдстаўнікі Віленшчыны і Менску, калі яны лічылі, што гэта патрэбна для адраджэньня Беларусі, каб узяць на сябе адказнасьць, прымушае мяне гаварыць аб гэтым.

Пэта запатрэбаваньне ліквідацыі, было ня толькі запатрэбаваньнем газэтным, але і пунктамі нарады прэдстаўнікоў Віленшчыны 2-верасня

Відаць, што язык гаварыў адно, а сумленьне і адкрытае выступленьне ў гэтым напрамку на Канфэрэнцыі спужалі храбрых ліквідатароў і яны вырэшылі лепш палажыцца на авантурызм Цвікевіча, які скончыць гэту справу самаліквідацыей, гэта знача самагубствам і выдасьць ім расьпіску ў тым, што просіць у сьмерці Беларускага Ураду нікога не вініць. Як і заўжды бывае Вільня ў гэты адпаведны момант умыла рукі.

Такім чынам Цвікевіч і компанія ліквідавалі сябе і выкінулі свае імёны з Беларускай Незалежніцкай Групы, але установа як Урад,

засталася. Выканаўчая ўлада да часу перайшла ў рукі Прэзыдіуму Ра[д]
і можэ быць узноўлена, калі гэта будзе патрэбна.

Юрыдычнай падставай дзеля гэтага служыць пастанова Рады Б.Н.Р. I3- сьнежня I9I9 г.

Дармо гэтую пастанову са сваім выхадам са складу Беларускага Ураду хацеў скампрамітаваць і Ластоўскі, калі надрукаваў у Літоўскай газэце"Летува" 24.IX.25. Нр.2I5. сваё абвешчэньне, дзе гаворы[ць]

"Беларускі Урад, выбраны ў Менску I3.XII.I9I9 г. Пленумам Рады БНР. у працівалежнасьць яўна Паланафільскай"Найвыжэйшай Радзе", скончыла сваё існаваньне 20-траўня I923 г., калі гал ва Ураду В.Ластоўскі злажыў свае паўнамоцтв[ы]. Новы Урад ня м[ог] быць сфармаваны, так як не было правамоцнага органу, які бы мог яго выбраць. Па Канстытуцыі Беларускі Урад павінен быў выбірацца выключна Плунумам Рады Рэспублікі".

Апрача таго, што такой пастановы не было В.Ластоўскі дармо хацеў даказаць, што з яго адыходам ад Ураду, нічога не засталося і ніхто не мае права стварыць новы Урад.

Факт нават з яго жыцьця ў бытнасьці Старшыні Ураду гаворыць зу сім не на яго карысьць.

Так 6- чэрвеня I920 г. мы маем пратакол сходу Прэзыдіуму Рады Беларускай Народнай Рэспублікі, запісаны ўласнаю рукою В.Ластоўска[га]

С Л У Х А Л І :

Пытаньне аб тым, што некаторые Члены Ураду (Рады Міністраў) Беларускай Народнай Рэспублікі, па варункам варожых акупацый на Беларусі, не маглі ўзяць удзелу ў даручанай ім Урадовай Працы, што адбілась і адбіваецца на працы Рады Народных Міністраў.

П А С Т А Н А В І Л І :

Каб пазбавіцца шкод, якія выплываюць з гэтага ненармальна[га] становішча, - скарыстаць надзвычайныя паўнамоцтвы, перэдадзе ные Радай Беларускай Народнай Рэспублікі I3- сьнежня I9I9 г. Прэзыдіуму Рады і даручыць Старшыне Рады Народных Міністраў, гр.Вацлаву Ластоўскаму, зрабіць належныя і вымаганыя варунка[мі] Дзержаўнай працы рэарганізацыі габінэту Рады Народных Міністраў з уключэньнем у яе склад новых асоб і партфэляў.

Віцэ-Маршалак Прэзыдіуму Рады БНР В.Захарко
Віцэ-Маршалак Прэзыдіуму Рады БНР. Палута Бад[у]
Сэкрэтар Прэзыдіуму Рады БНР Яз.Мамонько.

Як бачым у адносінах да надзвычайных правоў- вярхоўнай улады н[а] Беларусі - Прэзыдіума Рады - і да гэтай пары нічога не зьмянілась. Здрадны адыход ад працы асоб, ня можэ меняць Канстытуцыю Рэспублік[і] На іх мейсцы, як абаронцаў незалежнасьці, могуць быць запрошаны др[у] гія людзі.

Наша нешчасьце ў тым, што на працягу ўсей дзержаўна-адраджэнскай працы, мы на адпаведных становішчах выканаўчай улады, бачылі мала сумленных людзей і цяпер яны апынуліся ў варожым стане свайго народу. Людзі, якія ўчора служылі ідэалу незалежнасьці і на гэтым будавалі сваю палітычную карьеру, сёньня яе паганяць...

Німа пакуль дзержавы і німа аружжа бароцца з гэтым злом, але гэта не значыць, што мы ў роспачы павінны адмовіцца ад сваіх лепшых ідэалаў. Права не ў сіле. Часовая перэмога - не ёсьць закон на будучыну. Рамантызм ідэі творыць рэальнасьць, а не наадварот. Рэальнасьць падпарадкаўваецца слабейшых (!), а моцны духам рамантызм змагаецца і накрэсьлівае новыя шляхі будучыні.

Не апраўдаўшыя народнага даверра рэалісты адыйшлі ў старану, ці перайшлі ў варожы стан, а цьверды рамантызм ідэі незалежнасьці і яе дзержаўных установ жывець далей і будзе жыць, пакуль жыве сама ідэя.

П.К.

ГОЛАС ЭМІГРАЦЫІ

Эміграцыя заўжды была рэхам народу і праваднікам яго вольных думак і імкненьняў у шырокі сьвет агульна-чалавечага еднаньня. Тое, што ня мог сказаць і зрабіць народ у сябе дома, па варункам свае ці чужацкай улады і цанзуры, эміграцыя сьмела гаварыла, карыстаючыся свабодай слова заграніцай.

Біблію - першую кніжкуна беларускай мове, даў нам эмігрант Францішак Скарына, які ў абставінах"Жондув косьцельных" на чале з кракаўскім біскупам Збігневам Олесьніцкім пры Ягайле(I385-I434), ня мог заняцца гэтай працай на бацькаўшчыне, а мусіў працаваць у Празе Чэскай. Пасля занепаду беларускай дзержаўнасьці і культуры, зноў-такі першая беларуская кніжка прыходзіць да нас з Лёндану, Парыжу, Кракава, адтуль дзе знаходзіліся, хоць адзінкі заўжды беднай беларускай эміграцыі. Вайна і рэвалюцыя выгналі з беларускіх хат каля паўтара мільёна беларускага жыхарства і раскідала іх па ўсіх абшарах быўшае Расеі. Недалік пакінуўшых родныя мейсцы перад навалай, надзвычайна вялікі. Крыжыкамі і беларускімі касьцьмі ўслана ўся дарога на ўсход - да Сібіры і на поўдзень - да Сярэдняй Азыі і Аўганістану. Вярнуўшыеся да гэтае пары жывуць у зямлянках і служаць інтарэсам чужынцоў, то ў ролі кулакоў непралетарскага паходжэньня, то беларускага быдла для польскіх паноў.

Ня толькі нешта рабіць, але гаварыць і нават думаць яны свабодна ня могуць. Кожны крок іх пад Польшчай кантралюецца дэфэнзывай, а ў Савецкай Беларусі - Маскоўскім ГПУ. У найлепшых варунках духоўнага развіцьця апынулася беларуская эміграцыя заграніцай, якая ня гледзячы на цяжкі матэрыяльны стан і жорсткі кусок эмігрантскага хлеба, можа сьмела і аткрыта выказываць свае думкі на будучыну Беларусі. Карыстаемся гэтым правам і ў абарону свайго народу заяўляем:

Мы прызнаём культурна-нацыянальную аўтаномію ў Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспубліцы, вітаем зусільля ў адраджэньні беларускай культуры і дзяржаўнасьці, але ня можэм пагодзіцца з панаваньнем чужынцоў на Беларусі. Да гэтае пары ўсё народна-гаспадарчае, палітычнае і адміністратыўнае жыцьцё знаходзіцца ў руках Расейскай камуністычнай партыі, а не ў руках беларускага народу. Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка не мае ня толькі незалежнасьці, а нават сваей беларускай камуністычнай партыі і кіруецца камуністычнай партыей чужынцоў на Беларусі. Не паможэ гэтаму і апошняе пераўтварэньне Расейскай камуністычнай партыі на Усесаюзную, бо ўсё роўна цэнтр будзе знаходзіцца ў Маскве, а беларускіе члены будуць іх падслугачамі.

Калі Канстытуцыя СССР.(раздзел 2.,арт.24 4) кажэ, што дэмократычнай самастойнасьці Беларусі Проціўпастаўляем нашу самастойнасьць БССР, якая пабудована на аснове праграмы ВКП., то можна сабе ўявіць, што гэта за свабода з правам свабоднага выхаду з саюзу, калі ею кіруе Расейская Камуністычная партыя.

Нацыянальная па форме і пралетарская па зьместу,(Сталін) культура да нас дапасоўвацца ня можа, бо мы зусім не маем пралетарыату. Рабіць з сярэдняка (у нас іх не менш 70-80%) бедняка - знача нішчыць гаспадарку і ствараць штучны кадр пралетарыату для абароны сваей дыктатуры над сялянствам. Бедняк можэ браць, но нічога ня можэ даць, абярнуць сярэдняка ў беднякоў - знача тварыць жабрацкую рэспубліку з заўнічым нахілам у той бок, дзе хто нешта яшчэ мае. Нацыянальная палітыка, якой яна павінна быць і па зьместу, дае права на абарону бацькаўшчыны, не залічываючы яе ў контрэвалюцыйны лягер. Аб гэтым гаварыў камуністам і сам Ленін, яшчэ далёка да рэвалюцыі, але камуністы ледзя адважыліся аб гэтым сказаць толькі ў 1924 г. - Ленін кажэ: "На абшарах Беларусі і Украіны бацькаўшчына тут яшчэ не адсьпевала сваей гістарычнай песьні. Абарона бацькаўшчыны яшчэ можэ тут быць абаронай дэмократыі, роднай мовы, палітычнай свабоды супроць прыгнятаючых нацый, супроць сярэднявеча"(Сборник Звезда. Аб карыкатуры на марксізм. 1924 г. бал.120). Знача гэта не ухіл, не контрэвалюцыя, а права, якое спішаюцца абмінуць камуністы ў хуткім бегу да сусьветнай сацыяльнай рэвалюцыі. Такі ўхіл камуністаў ад гістарычнага ходу падзей на Беларусі калечыць ня толькі народную душу беларуса, але і будучыну - дзяцей. Дыктатура над беларускім сялянствам ёсьць найгоршы злачын сучаснага стану Беларусі і з ім мусіць змагацца кожная жывая беларуская душа.

Мя ня можам пагодзіцца і са станам прыгнечэньня беларускага жыхарства ў Заходняй Беларусі пад Польшчай. Калі ў Савецкай Сацыялістычнай Рэспубліцы жыхарства адпачывае хоць на роднай мове і школе, церпячы ўціск палітычны і эканамічны, то ў Заходняй Беларусі яно не мае ніякіх правоў, з ім запраўды расправуляюцца як з быдлам. Родная

мова ганьбіцца, школы зачыняюцца - беларус абернут у бэзвольнага раба, які знаходзіцца ў поўным распараджэньні пана, як у старе часы паншчыны. Асадніцтва, выганяючы з родных хат беларускае жыхарства, калёнізуе Беларусь польскім элемэнтам. Галодная сьмерць заглядае ў вочы жыхара землянкі, пасля праўных і непраўных пабораў даніны. Замест абароны правоў беларускага народу Пасольскі клюб Селянска-рабочай Грамады ў Варшаве разбівае адзін нацыянальны фронт у гэтай абароне і шукае аб'еднаньня з польскай хлопскай партыей, якая бараніць інтарэсоў беларускіх ня будзе, а будзе падпаткаваць сабе беларускіе сілы таксама, як хоча падпараткаваць сабе польская камуністычная партыя - камуністычную партыю Заходняй Беларусі. Адарваўшысь ад нацыанальнага фронту Селянска-рабочая грамада хістаецца паміж польскай і расейскай камуністычнай иартыей і стараецца, не маючы зусім свайго пралетарыату, бараніць пралетарыат чужынцоў супроць беларускага селянства. Пасол Тарашкевіч нападае на Беларускі Селянскі Саюз за тое, што ён разрожнівае інтарэсы вёскі і места - селян і рабочых. Разрожніваць трэба. Ніколі вёска не пагодзіцца з местам, калі нават не совй, а чужы пролетарыат будзе забіраць хлеб амаль дарма і нічога не даваць вёсцы.

Рабочэ-селянская грамада ўнясла разлад у беларускія арганізацыі Заходняй Беларусі і развязала рукі тым элемэнтам, якім даўно хацелася развязацца з беларускай незалежнасьцю. Група Паўлюкевіча пачала вясьці працу за прылучэньне Заходняй Беларусі да Польшчы, каб пазбавіцца бальшэвізму, а Крыніца пястуе думку прылучэньня Заходняй Беларусі да Літвы. Атрута разладу праз Вільню дасягнула і заграніцы. Пасля зменнатычніцкай нарады ў Бэрліне, дзе некалькі чалавек перайшло на прызнаньне Савецкай улады - гэта самая акцыя павялася і паміж Чэхаславацкай беларускай эміграцыей. Пражскіе камуністы і зменнатычнікі майоранізацыей захапіць Беларускую Раду ў Празе ў свае рукі, каб знішчыць праўную нацыанальную арганізацыю заграніцай і абярнуць эмігрантаў у бэзпраўную массу, якаяб выпрашывала міласьці ў Масквы для звароту на бацькаўшчыну. Гэты напор беларускай эміграцыей з гонарам быў адкінуты і Саветы ня толькі не захапілі Беларускай Рады ў Празе ў свае рукі, але самі ганебна былі ўсе дачыста выкінуты з Рады Дэфэрэнцыяцыя сіл, такім чынам адбылася заграніцай таксама як і на бацькаўшчыне. Далей мусіць пайсьці спакойная творчая праца і змаганьне за ідэалы незалежнасьці. Мы прапануем аб'еднаць усе незалежніцкія сілы беларускага народу ў барацьбе за сваё вызваленьне на падставе другой Устаўной Граматы Выканаўчага Камітэту Рады першага Усебеларускага Зьезду ад 8-сакавіка I9I8 г.

§ 5. У межах Беларускай Народнай Рэспублікі абвешчаецца свабода слова, друку, сабраньняў, забастовак, саюзаў; бэзумоўная свабода вызнаньня, недатычнасьць асобы і памешканьня.

§ 6. У межах БНР. усе народы маюць права на нацыанальна-пэрсана-

льную аўтаномію; абвешчаецца раўнапраўнасьць усіх моў народаў Беларусі.

§7. Зямля бэз выкупу перэдаецца тым, хто сам на ёй працуе. Лясы, вазёры і нутра зямлі абвешчаюцца ўласнасьцю БНР.;

§8. У межах БНР. устанаўліваецца найбольшы асьмігадзінны дзень працы. Усе гэтыя свабоды і вольнасьці сьцьверджаюцца і трэцьцяй Устаўной граматай Рады Беларускай Народнай Рэспублікі 25-сакавіка I9I8 г., калі скінуўшы апошняе ярмо дзержаўнай залежнасьці ад Расеі, беларускі народ прызнаў сябе сувэрэнным гаспадаром Беларусі і абвесьціў Беларускую Народную Рэспубліку - незалежнай і вольнай дзержавай.

Беларуская палітычная эміграцыя, якая ў сваіх радох не мае буржуазна-капіталістычных, ці абшарніцкіх элемэнтаў, бо выхадцы з Беларусі - рэнэгаты - да нашай групы належаць не могуць, - зьяўляецца натуральным рэзультатам паневаленьня Беларусі і нашага часовага занепаду. Прабываньне эміграцыі заграніцай ёсьць, хоць сумны, але немінучы факт усясьветнага пратэсту супроць пагвалчэньня нашай дзержаўнасьці з аднаго боку і вольная трыбуна вольнай беларускай думкі з другога. Але выканаць сваю гістарычную ролю поўнасьцю палітычная эміграцыя зможа толькі пры маральнай падтрымцы беларускага народу. Трэба адмовіцца ад недарэчных папрокаў сваім братом, выкінутым заграніцу і не маючым магчымасьці бараніцца. Жорсткі кусок эмігрантскага хлеба ніхай не дзярэ горла Беларускай Крыніцы (II.X.25 Нр.3) і Беларускай Нівы (2.XII.25г.Нр.5) бо ўсё роўна:

Напасьцяй, лаянкай напраснай
Грудзей ня варта мазаліць.
Не пагасіць вам праўды яснай:
Жыў беларус і будзе жыць.

Можэм сказаць разам з Я Купалам не толькі ворагам беларушчыны, але і сваім, хто вырэкаецца незалежнасьці.

В.Русак.